«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне. Што трэба ведаць?



Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 22 сакавіка дапоўнена

22.03.2023 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, адміністратыўны пераслед, грамадства, палітвязні, пераслед, рэпрэсіі, затрыманні

У Беларусі па-ранейшаму працягваюцца затрыманні, ператрусы, катаванні ў ізалятарах, аказваецца ціск на палітвязняў, незалежныя медыяпрадукты прызнаюць экстрэмісцкімі матэрыяламі. Адбываюцца рэпрэсіі ў дачыненні да грамадзян, якія актыўна выказваюць сваю пазіцыю ў адносінах да вайны, распачатай узброенымі сіламі Расіі. Праваабарончы цэнтр "Вясна" 22 сакавіка збірае факты палітычнага пераследу беларусаў – інфармацыя ўвесь час дапаўняецца.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:

- *праз тэлеграм-бот @viasna_bot;*
- *на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna*

Затрыманні па ўсёй краіне напярэдадні Дня Волі

У Воршы за некалькі дзён было затрымана і адміністрацыйна асуджана каля двух дзясяткаў чалавек



Аляксандр Школьнікаў

Цягам некалькіх дзён запар аршанская міліцыя праводзіла ператрусы і затрымлівала людзей за пасты ў сацыяльных сетках. У выніку рэйду яны залавілі як мінімум 12 чалавек у Воршы, і аднаго жыхара Сянно. Усім затрыманым мужчынам аршанскія суддзі прызначылі пакаранне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту ад 10 да 15 сутак, а кожную жанчыну штрафавалі аднолькава на 1850 рублёў.

Вядома, што першым, хто трапіў пад рэпрэсіі, быў аршанец сябра аргкамітэта па стварэнні сацыял-дэмакратычнай партыі "Грамада" Аляксандр Школьнікаў. Пазней з'явілася інфармацыя пра яго затрыманне і ператрус у яго кватэры. Аляксандр інвалід па зроку, аднак да суда міліцыянты адправілі яго ў ізалятар часовага ўтрымання. Суд арыштаваў Школьнікава мінімум на 10 сутак.

ГУБАЗіК затрымаў двух жыхароў Гродна

Праўладныя тэлеграм-каналы апублікавалі відэа з затрыманнем на працы двух гродзенцаў. На іх мужчыны гавораць, што былі затрыманы за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў. Вядома, што на гродзенцаў склалі пратаколы і адправілі ў ІЧУ.

Гомельская міліцыя адсправаздачылася аб новых палітычных затрыманнях



Сілавікі прадэманстравалі відэа, запісаныя з сямю чалавекамі з Гомеля, Мазыра і Калінкавічаў. Іх абвінавачваюць у праяўленні нелаяльнасці да рэжыму Лукашэнкі. Сярод затрыманых — Аляксандр Тарасевіч і Вераніка Нікалкіна, а таксама жыхары Мазыра Мікалай Пышнік і Кірыл Гамаюнаў. Паведамляецца, што іх затрымалі за «падпіскі на тэлеграм-каналы і негатыўныя выказванні ў бок сілавікоў ды расійскіх войскаў».

Паведамляецца пра зачыстку ў Мазыры — сілавікі праводзяць ператрусы і затрыманні



Паводле крыніц, ператрусы прайшлі ў некаторых людзей, якіх раней судзілі за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў». У планах сілавікоў было наведаць не менш за 35 чалавек.

Перастаў выходзіць на сувязь са сваякамі муж палітзняволенай Крысціны Чаранковай **Фёдар Чаранкоў**. Ягоны бацька паведаміў, што Фёдара трымаюць у ІЧУ і склалі на яго адміністратыўны пратакол.

Паведамляецца пра затрыманні ў Пінску

22 сакавіка ў Пінску сілавікі затрымлівалі людзей. Праваабаронцам вядомы прозвічшы трох затрыманых. Магчыма, колькасць затрыманых нашмат большая.

Паколькі сілавікі не мясцовыя і спыніліся ночыць у пінскім гатэлі, актывісты чакаюць працяг «рэйду».

Адміністрацыйны пераслед

Адваката Арцёма Сям'янава арыштавалі на 15 сутак

Пра гэта паведамляе "Медыязона" са спасылкай на блізкіх аднаго з яго падабаронных. Адваката абвінавацілі паводле арт. 24.3 КаАП (непадпарадкаванне).

Нагадаем, Сям'янаў быў затрыманы напачатку тыдня падчас «аблавы» на адвакатаў. Арцём абараняў Валянціна Стэфановіча, Аляксандра Францкевіча, Таццяну Кузіну, Ігара Лосіка, Паўла Белавуса і шмат каго з іншых палітвязняў.

Жыхару Глыбокага прысудзілі штраф у 2590 рублёў за сцяг Украіны і герб «Пагоня»



Як стала вядома «Віцебскай Вясне», 3 сакавіка суддзя суда Глыбоцкага раёна Андрэй Тарасевіч разгледзеў адміністрацыйную справу мясцовага прадпрымальніка Юрыя Татарыновіча і прысудзіў яму штраф памерам 70 базавых велічыняў, што складае 2590 рублёў.

Мужчыну судзілі паводле ч. 1 арт. 24.23 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў). Быццам ён без атрымання адпаведнага дазволу Глыбоцкага райвыканкама правёў адзіночнае пікетаванне з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-

палітычных поглядаў. А выявілася гэта ў тым, што ён, размясціў сваё фота ў сацыяльнай сетцы «Фэйсбук», якое суправаджалася графічнай выявай двухкалора — сцяга Украіны і герба «Пагоня». Таксама на старонцы была публікацыя з выявай бел-чырвона-белага сцяга.

Падчас судовага пасяджэння Юрый Татарыновіч віну не прызнаў.

Ціск на палітвязняў

Палітзняволенага Мікалая Казлова змясцілі ў карцар



Пра гэта паведамляе Анатоль Лябедзька:

> «Адразу пасля выхаду з каранціна лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Мікалая Казлова кінулі ў карцэр. Там ён прабудзе да 26 сакавіка! Сталінская сістэма адрадзілася ў Беларусі. Але такіх як Мікола яна не ломіць, а толькі загартоўвае!».

Мікалай — беларускі палітык, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі. 6 жніўня 2021 года яго асудзілі на 3 месяца арышту за разгалошванне дадзеных следства па справе Каардынацыйнай рады.

27 ліпеня 2022 года яго зноў затрымалі разам з іншымі сябрамі АГП. Яго абвінавацілі ва ўдзеле ў «Маршы новай Беларусі» ў Мінску ў 2020 годзе (арт. 342 КК). 3 лістапада Мікалаю прысудзілі 2,5 гады калоніі. На судзе ён выступіў з моцным апошнім словам.

Сёння адбудзецца разгляд справы аб пераводзе палітзняволенага Мікіты Емяльянава на турэмны рэжым




Працэс у 16:50 у судзе Ваўкавыскага раёну пачне разглядаць суддзя Мікалай Сяргейка.

Нагадаем, актывіста анархічнага руху Мікіту Емяльянава год таму асудзілі на два гады калоніі па ч. 2 арт. 411 КК (злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы), а канчаткова прызначылі па сукупнасці прысудаў з улікам раней неадбытага пакарання — тры з паловай гады калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Іншыя навіны пераследу

Мінскі сябра БСДП Аляксей Гаравы пераведзены ў следчы ізалятар



Паводле якога артыкулу абвінавачваецца сацыял-дэмакрат — невядома. Аляксей Гаравы быў затрыманы ГУБАЗіКам 20 лютага на працы. Пасля ператрусу ў мінскай кватэры разам з жонкай быў дастаўлены ў міліцыю.

Пазней жонку адпусцілі да малога дзіцяці, а Аляксей быў змешчаны ў ізалятары на Акрэсціна і пазней асуджаны на 14 сутак за нібыта «непадпарадкаванне».

6 сакавіка родныя не дачакаліся вызвалення Аляксея. У Фрунзенскім РУУС ім паведамілі, што яго забраў ГУБАЗіК. На наступны дзень яго ізноў асудзілі на чарговыя 15 сутак адміністрацыйнага арышту і зноў за «непадпарадкаванне». Пазней на праўладным тэлеграм-канале з'явілася «пакаяльнае відэа», дзе Аляксей распавядае, што ён нібыта пакідаў свае каментары ў адрас сілавікоў.

У пункце пропуску «Брэст — Цярэспаль» беларускія сілавікі выбарачна правяраюць тэлефоны ў тых, хто выязджае з Беларусі

Па інфармацыі, у тых, хто выязджае з Беларусі ў Польшчу на аўтобусах праз пункт пропуску «Брэст-Цярэспаль» учора выбарачна правяралі тэлефоны. Сілавікоў цікавілі спісы ўсталяваных і выдаленых праграм, гісторыя Youtube, перапіскі ў Telegram, фотагалерэя, кошык галерэі, лайкі, каментары, сторыс у Instagram, а таксама перапіскі ў іншых месэнджарах.

Для тых, хто ўязджае, таксама праводзіцца праверка тэлефона.

Опубликовать



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму


"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі

"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Больш за 8000 жанчын зазналі палітычны пераслед у Беларусі. Рэпрэсіі ў адносінах да жанчын — у інфаграфіках

Дайджэст вызваленых: мінімум 24 палітвязні ў лютым выйшлі на волю па заканчэнні тэрміну

Палітвязню Алегу Рубцу прызначылі яшчэ паўтара года зняволення

Былая палітзняволеная Алена Дзядзюля: "Я абяцала жанчынам, што буду распавядаць пра іх лёсы паўсюль, дзе магу"

Арышт за "Жыве Беларусь" і забойства расійскімі сілавікамі беларускага актывіста: хроніка пераследу 6-7 сакавіка (дапоўнена)

За Марш асудзілі мужа і жонку: іх затрымалі, калі яны выязджалі з Беларусі ў госці да дзяцей


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Люты 2024


ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections epde











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

